Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ А. І. Жук
“___” ____________2011 г.
Рэгістрацыйны №-ТД- ___ / тып.

**ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ**
**Раздзел II. БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці**
**1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела
навучальных устаноў
і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________А. У. Рыбчынская
“___” __________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б. У. Святлоў
“___” ___________2011 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю. І. Міксюк
“___” ___________2011 г.

Прарэктар па вучэбнай
і выхаваўчай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”
____________ В. І. Шупляк
“___” ___________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр
_____________________
“___” ___________ 2011 г.

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*А. А. Гулак,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* этналогіі і фалькларыстыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка”;

*А. С. Ліс*, галоўны навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, доктар філалагічных навук

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 9 ад 24.03.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 7 ад 08.06.2010 г.);

*навукова-метадычным* саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 5 ад 11.05.2011 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *А. А. Гулак*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Вусная народная творчасць” складаецца з двух раздзелаў: “Тэорыя фальклору” і “Беларускі фальклор”. Дадзеная праграма прызначана для вывучэння другога раздзела “Беларускі фальклор”.

Праграма распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор).

Змест раздзела “Беларускі фальклор” прадугледжвае выкладанне з улікам тэарэтычных дасягненняў сусветнай і айчыннай фалькларыстыкі, выкарыстанне значнага навуковага матэрыялу па тэорыі фальклору, даследаванняў па асобных праблемах фальклору, фалькларыстычных зборнікаў, а таксама навукова-публіцыстычных і навукова-папулярных работ.

Выкладанне раздзела “Беларускі фальклор” вучэбнай дысцыпліны “Вусная народная творчасць” прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: “Этнаграфія”, “Міфалогія” і “Гісторыя Беларусі”.

*Мэта вывучэння раздзела* – узбагаціць будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры ведамі па беларускім фальклоры як найважнейшай часткі беларускай нацыянальнай культуры на аснове фарміравання нацыянальнай свядомасці і нацыянальнага прафесійнага мастацтва; сфарміраваць у будучых спецыялістаў у галіне беларускай народнай культуры разуменне фальклору як унікальнага і самабытнага мастацтва, якое мае глыбока гуманістычны характар і валодае вялікім багаццем мастацка-выяўленчых сродкаў.

*Задачы вывучэння раздзела:*

– забяспечыць засваенне студэнтамі асноўных паняццяў і тэрмінаў фалькларыстычнай навукі, азнаёміць з асноўнымі метадамі фалькларыстычнага даследавання;

– пазнаёміць з гісторыяй станаўлення і развіцця навукі аб фальклоры;

– сфарміраваць асновы даследчыцкай культуры студэнта, закласці тэарэтычную базу для развіцця даследчыцкіх навыкаў будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры;

– ажыццявіць тэарэтычнае і практычнае азнаямленне студэнтаў з узорамі беларускага фальклору.

У выніку вывучэння раздзела “Беларускі фальклор” студэнты павінны *ведаць*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– агульнатэарэтычныя пытанні беларускай фалькларыстыкі і асноўныя крыніцы навуковай інфармацыі па фальклоры;

– важнейшыя віды абрадавай і пазаабрадавай народнай творчасці, іх ідэйны змест і сістэму жанраў;

– адмысловыя і адметныя з’явы традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў;

– асноўныя метады фалькларыстычных даследаванняў і методыку збірання фальклору.

Студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць фальклорныя творы з пункту гледжання іх архаікі, прыналежнасці да таго ці іншага абраду ці да пэўнай сістэмы жанраў;

– выяўляць найбольш дасканалыя ў мастацкіх адносінах узоры фальклорных твораў і іх сувязь з іншымі часткамі духоўнай культуры;

– самастойна працаваць з навуковай літаратурай, з першакрыніцамі па прадмеце;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях фалькларыстыкі і сумежных з ёй дысцыплін;

– прымяняць набытыя ўменні ў кантэксце сваёй прафесійнай дзейнасці.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага фальклору і фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– метад фалькларыстычнага даследавання;

– метад літаратуразнаўчага аналізу фальклорных тэкстаў.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне раздзела “Беларускі фальклор” вучэбнай дысцыпліны “Вусная народная творчасць” усяго адведзена 236 гадзін, з якіх 164 – аўдыторныя заняткі (70 гадзін лекцый, 50 – семінарскіх і 44 – практычных).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. зан. | практ. зан. |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Тэарэтычныя асновы раздзела “Беларускі фальклор”** | | | | |
| *Тэма 1.* Фальклор як частка духоўнай культуры народа | 7 | 3 | | 4 |
| *Тэма 2.* Вывучэнне фальклору | 10 | 4 | | 6 |
| **Раздзел II. Каляндарна-абрадавая творчасць** | | | | |
| *Тэма 3.* Каляндарна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура | 6 | 4 | | 2 |
| *Тэма 4.* Каляндарна-абрадавая творчасць зімовага цыкла | 10 | 6 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Каляндарна-абрадавая творчасць веснавога цыкла | 14 | 6 | 4 | 4 |
| *Тэма 6.* Каляндарна-абрадавая творчасць летняга цыкла | 12 | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 7.* Каляндарна-абрадавая творчасць восеньскага цыкла | 6 | 2 | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Сямейна-абрадавая творчасць** | | | | |
| *Тэма 8.* Сямейна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура | 6 | 2 | | 4 |
| *Тэма 9.* Радзінна-хрэсьбінная паэзія | 10 | 4 | 4 | 2 |
| *Тэма 10.* Вясельная паэзія | 12 | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 11.* Паэзія пахавальнай абраднасці | 6 | 4 | | 2 |
| **Раздзел IV. Пазаабрадавы фальклор** | | | | |
| *Тэма 12.* Песенныя жанры фальклору | 18 | 4 | 8 | 6 |
| *Тэма 13.* Празаічныя жанры фальклору | 18 | 8 | 8 | 2 |
| *Тэма 14.* Малыя празаічныя жанры фальклору | 16 | 6 | 8 | 2 |
| *Тэма 15.* Замовы | 6 | 2 | 4 | |
| *Тэма 16.* Народны тэатр | 6 | 2 | 4 | |
| **Разам…** | **164** | **70** | **50** | **44** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Прадмет і задачы раздзела “Беларускі фальклор”. Сувязь з іншымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

Азначэнне фальклору. Паняцці “фальклор”, “вуснапаэтычная творчасць”, “народная паэтычная творчасць”, “духоўная культура”, “традыцыйная духоўная культура”. Асноватворныя катэгорыі – універсальныя ўласцівасці фальклорнай творчасці: *сінкрэтызм* як непадзельнасць структурных кампанентаў народнай мастацкай творчасці: слова, музыкі, танца і пантамімы ў традыцыйных відах фальклору; *калектыўнасць* творчага працэсу як дыялектычнае адзінства індывідуальнай і масавай творчасці; *традыцыйнасць* як устойлівасць і паўтаральнасць усіх асаблівасцей і кампанентаў фальклорнага твора; *варыятыўнасць* як спосаб развіцця і пераемнасці існавання народнай творчасці шляхам вар’іравання сюжэтных тэм, матываў, вобразаў, паэтычных сродкаў; *вуснасць* як адсутнасць матэрыяльнай замацаванасці, фіксаваных формаў перадачы фальклорных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел І. Тэарэтычныя асновы раздзела “Беларускі фальклор”

### *Тэма 1. Фальклор як частка духоўнай культуры народа*

Адлюстраванне ў фальклоры архаічных вераванняў і культаў, працоўнага і сацыяльнага вопыту, народнай этыкі, маралі. Класіфікацыя фальклору па абрадавай, жанравай, сацыяльнай, узроставай прыналежнасці. Поліфункцыянальнасць фальклору: сакральна-магічная, абрадавая, рэлігійная, цырыманіяльная, пазнавальная, выхаваўчая, эстэтычная, геданічная функцыі фальклору. Фальклярызм.

### *Тэма 2. Вывучэнне фальклору*

Асноўныя школы ў гісторыі сусветнай і славянскай фалькларыстыкі: міфалагічная, гісторыка-параўнальная, этналінгвістычная, міграцыйная (кампаратывісцкая), фінская (гісторыка-геаграфічная). Сувязь фалькларыстыкі з этналогіяй, псіхалогіяй, лінгвістыкай, літаратуразнаўствам, мастацтвазнаўствам  і культуралогіяй. Агульныя сферы даследаванняў і комплекснае вывучэнне фальклору як поліэлементнай структуры.

## Раздзел II. Каляндарна-абрадавая творчасць

*Тэма 3. Каляндарна-абрадавая творчасць:*
*генезіс, жанравая структура*

Каляндарна-абрадавая творчасць як першакрыніца, карэнная з'ява народнай культуры. Генезіс каляндарных абрадаў і звязанай з імі паэзіі. Каляндарныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры. Спецыфіка міфапаэтычнага асваення рэчаіснасці ў каляндарна-абрадавай паэзіі. Фальклярызацыя хрысціянскіх свят. Гістарычныя перадумовы развіцця і захаванасці беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі.

*Тэма 4. Каляндарна-абрадавая творчасць зімовага цыкла*

Зімовы цыкл земляробчага календара. Падзел песень зімовага цыкла па функцыянальнай прымеце: піліпаўскія, калядныя і шчадроўскія, цярэшкі, масленічныя (запусныя) песні, песні да зімовых карагодаў і гульняў. Адлюстраванне абраднасці ў песнях зімовага цыкла. Песні зімовага цыкла паводле жанравай прыроды: велічальныя, заклінальныя, гумарыстычныя, лірычныя і эпічныя. Паэтызацыя працы земляроба. Міфалагічныя, любоўна-шлюбныя і сямейныя матывы. Павер'і, прыказкі і прыметы зімовага цыкла. Увасабленне гаспадарчага і метэаралагічнага вопыту народа. Гульні і варажба зімовага цыкла.

*Тэма 5. Каляндарна-абрадавая творчасць веснавога цыкла*

Веснавы цыкл земляробчага календара. Выключнае багацце сацыяльна-этычнага напаўнення. Жанравая разнастайнасць веснавой паэзіі. Падзел песень веснавога цыкла па функцыянальнай прымеце: песні-вяснянкі, валачобныя, юр'еўскія, траецкія (сёмушныя), куставыя, русальныя песні, песні веснавой талакі, песні да веснавых карагодаў і гульняў. Адлюстраванне абраднасці ў песнях веснавога цыкла. Унікальнасць валачобнага абраду і валачобных песень у традыцыйнай культуры беларусаў. Паэтызацыя прыроды, працы і дабрабыту земляроба. Міфалагічныя і любоўна-шлюбныя матывы. Вобразы песень веснавога цыкла. Песні веснавога цыкла паводле жанравай прыроды: велічальныя, заклінальныя, гумарыстычныя, лірычныя і эпічныя. Павер'і, прыказкі, прыметы і іншыя малыя жанры фальклорнай прозы ў каляндарна-абрадавай творчасці веснавога цыкла. Увасабленне гаспадарчага і метэаралагічнага вопыту народа. Варажба, гульні і карагоды веснавога цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Каляндарна-абрадавая творчасць летняга цыкла*

Летні цыкл земляробчага календара. Жанравая разнастайнасць летняй паэзіі. Падзел песень летняга цыкла па функцыянальнай прымеце: касецкія, купальскія, пятроўскія, песні да летніх карагодаў, жніўныя. Унікальнасць захаванасці купальскага абраду і песень у традыцыйнай культуры беларусаў. Адлюстраванне абраднасці і працоўнай дзейнасці ў песнях летняга цыкла. Міфалагічныя, любоўна-шлюбныя і рэалістычна-бытавыя матывы. Вобразы песень летняга цыкла. Песні летняга цыкла паводле жанравай прыроды: заклінальныя, велічальныя, лірычныя, гумарыстычныя, эпічныя, балады. Маральна-этычная і сацыяльная праблематыка. Прыказкі, павер'і і легенды ў каляндарна-абрадавай творчасці летняга цыкла.

*Тэма 7. Каляндарна-абрадавая творчасць восеньскага цыкла*

Восеньскі цыкл земляробчага календара. Эмацыянальны лад песеннай лірыкі. Падзел песень восеньскага цыкла па функцыянальнай прымеце: ярынныя, ільняныя, талочныя. Адлюстраванне гаспадарчай дзейнасці. Песні восеньскага цыкла паводле жанравай прыроды: ліра-эпічныя, велічальныя. Прыродныя і шлюбна-сямейныя матывы. Вобразы песень восеньскага цыкла. Прыказкі, павер'і і легенды ў каляндарна-абрадавай творчасці восеньскага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Сямейна-абрадавая творчасць

*Тэма 8. Сямейна-абрадавая творчасць: генезіс, жанравая структура*

Сямейна-абрадавая творчасць як важнейшая частка народнай культуры. Генезіс сямейных абрадаў і звязанай з імі паэзіі. Сямейныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя і харэаграфічныя жанры. Сямейна-абрадавы фальклор як крыніца вывучэння светапоглядных уяўленняў, сістэмы сацыяльных адносін, народнага побыту і маралі. Спалучэнне сакральна-магічнай, абрадавай, цырыманіяльнай, эстэтычнай і выхаваўчай функцый.

*Тэма 9. Радзінна-хрэсьбінная паэзія*

Радзінна-хрэсьбінная паэзія як спецыфічная з'ява беларускай сямейна-абрадавай паэзіі. Радзінная абраднасць. Радзінна-хрэсьбінныя песні паводле жанравай прыроды: заклінальныя, велічальныя, гумарыстычныя, прыпеўкі. Матывы, вобразы і паэтычныя сродкі.

Празаічныя рытмізаваныя жанры: прыгаворкі, тосты-зычанні. Сям'я і народная педагогіка ў прыказках. Захаванасць радзінна-хрэсьбіннай абраднасці і паэзіі ў сучасным жыцці.

*Тэма 10. Вясельная паэзія*

Вясельная абраднасць. Сінкрэтызм. Жанравае багацце песень беларускага вяселля. Іх рэгламентуючая функцыя. Адлюстраванне этапаў вясельнага абраду ў песнях. Вясельныя песні паводле жанравай прыроды: велічальныя, лірычныя, цырыманіяльна-рытуальныя, сатырычна-гумарыстычныя, прыпеўкі. Матывы, вобразы і паэтычныя сродкі. Славесныя і драматызаваныя жанры беларускага вяселля: заклінанні, прыгаворы, тосты-зычанні, сцэнкі, гульні. Прыказкі пра шлюб, выбар пары, адносіны ў сям'і і сямейныя абавязкі. Захаванасць вясельнай абраднасці і паэзіі ў сучасным жыцці грамадства.

*Тэма 11. Паэзія пахавальнай абраднасці*

Пахавальная і памінальная абраднасць. Міфалагічныя і рэлігійныя ўяўленні. Узоры паэзіі пахавальнай абраднасці паводле жанравай прыроды: галашэнні, псалмы, духоўныя вершы. Імправізацыйная прырода галашэнняў. Традыцыйная паэтыка як сродак павышэння эмацыянальнасці. Прыказкі пра смерць, сіроцтва, удаўство. Захаванасць пахавальнай абраднасці і паэтычнай творчасці ў сучасным жыцці.

## Раздзел IV. Пазаабрадавы фальклор

*Тэма 12. Песенныя жанры фальклору*

Песня – універсальны лірычны жанр фальклору. Лірыка – вуснамоўнае паэтычна-песеннае мастацтва, сродак эстэтычнага самавыяўлення асобы, раскрыцця ўнутранага свету чалавека. Падзел народнай песеннай лірыкі паводле тэматычнага прынцыпу: лірыка кахання, сямейная, жартоўная, сацыяльна-бытавая. Гістарызм сацыяльна-бытавой лірыкі. Песні казацкія, чумацкія, антыпрыгонніцкія, бурлацкія, батрацкія, прымацкія, рэкруцкія і салдацкія песні.

Падзел народнай песеннай лірыкі паводле жанравай прыроды: песні эпічныя (гераічныя, гістарычныя, сацыяльна-бытавыя, камічныя), лірыка-эпічныя (балады, народныя рамансы), лірыка-драматычныя (гульнявыя, карагодныя).

Лірычны герой. Традыцыйныя матывы народнай лірыкі. Сродкі мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ў беларускай песеннай лірыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 13. Празаічныя жанры фальклору*

Празаічныя жанры фальклору: спосаб мастацкага адлюстравання і асэнсавання рэчаіснасці. Казкавая проза: казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя (уласна бытавыя, сацыяльна-бытавыя і навелістычныя). Алегарычнасць як аснова вобразнай сістэмы казак пра жывёл. Трансфармацыя архаічнага канфлікту чалавека і сіл прыроды ў сацыяльны або бытавы канфлікт у чарадзейнай казцы. Сацыяльныя адносіны, сялянскі побыт і народныя маральна-этычныя нормы ў бытавых казках. Разнавіднасці казачнага эпасу: легендарныя казкі, казкі-небыліцы. Народнае пераасэнсаванне рэлігійных догматаў у легендарных казках. Сродкі стварэння мастацкіх вобразаў у казках-небыліцах.

Няказкавая проза: легенды, паданні, сказы, прымхліцы. Інфарматыўная функцыя як вызначальны фактар няказкавай прозы. Легенды паводле гісторыка-тэматычнага прынцыпу: этыялагічныя (касмаганічныя, зааганічныя), духоўна-этычныя, гісторыка-культурныя, дэманалагічныя. Светапоглядны дуалізм легенд. Прынцыпы гуманізму і народнай этыкі ў легендах. Паданні паводле тэматычнага прынцыпу: гістарычныя, тапанімічныя, паданні пра скарбы, міфалагічныя паданні. Анекдоты, жарты.

*Тэма 14. Малыя празаічныя жанры фальклору*

Разнавіднасці народнай афарыстыкі: прыказкі, прымаўкі, прыметы, павер'і, загадкі, выслоўі. Пытанні тэрміналогіі і размежавання жанраў: прыказкі і прымаўкі, прыметы і павер'і. Закончанасць думкі як вызначальнае адрозненне. Сінанімія і антанімія. Праблема літаратурнага перакладу. Прыказкі як увасабленне народнай мудрасці, жыццёвага вопыту і маральна-этычных норм. Разнастайнасць іх тэматыкі. Афарыстычнасць прыказак, іх класіфікацыя. Анімістычная аснова загадак, сувязь іх з іншасказальнай мовай. Этнаграфізм загадак. Багацце жанравых формаў загадак (сказы, пытанні, жарты, задачы). Прыказкі і загадкі як сюжэтны элемент у песнях і казках.

*Тэма 15. Замовы*

Унікальнасць і архаічнасць жанру. Анімістычная аснова і ўтылітарна-магічная прырода замоў. Носьбіты замоў і асаблівасці бытавання. Знахарства і чарадзейства. Хрысціянская сімволіка ў замовах. Замовы паводле тэматычнага прынцыпу: гаспадарчыя, ахоўныя, лекавыя, замовы, звязаныя з сацыяльным і сямейным бытам. Кампазіцыя замоў. Паэтыка замоў. Існаванне замоў у сучасным жыцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 16. Народны тэатр*

Народны тэатр як від народнай творчасці. Умоўнасць мастацка-выяўленчых кампанентаў, непасрэднасць кантакту з гледачамі. Сінкрэтызм. Травестацыя. Лялечны тэатр "Батлейка". Школьны тэатр. Інтэрмедыі. Народная драма. "Цар Максімілян". Народная драма як найвышэйшая форма народнага тэатра. Карнавальныя матывы народнай драмы. Прымеркаванасць да каляднага цыкла народных гульняў і паказаў. Рэпертуар, галоўныя матывы і вобразы народнага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларуская* вуснапаэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. С. Ліс [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Лексіс, 2000. – 512 с.

2. *Беларускі* фальклор: хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 1985. – 749 с.

3. *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. энцыкл., 2005–2006.

4. *Беларусы:* у 11 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. навука, 1995. – Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / НАНБ; Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі [і інш.]; рэдкал.: В. М. Бялявіна, М. Ф. Піліпенка, У. І. Чаквін [і інш.]. – 2004. – 586 с.

5. *Казакова, І. В.* Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І. В. Казакова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.

6. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984–1987.


*Дадатковая*


1. *Аксамітаў, А.С.* Прыказкі і прымаўкі: тлумачальны слоўнік прыказак і прымавак з архіваў, кафедральных збораў, рэдкіх выданняў XIX і XX стст. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 319 с.

2. *Балады:* у 2 кн. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 337 с. – (Беларуская народная творчасць).

3. *Беларуская* міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2004. – 506 с.

4. *Беларускі* фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. / рэдкал.: А.С.Фядосік (гал. рэд.) [і інш.], АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. навука, 2001–2006. – Кн. 1: Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс [і інш.]. – 2001. – 515 с.; Кн. 3: Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей. – 2002. – 563 с.

5. *Беларускія* прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы: зборнік / склад. Ф. Янкоўскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 493 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Валачобныя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад.: Г. А. Барташэвіч [і інш.]; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 549 с. – (Беларуская народная творчасць).

*7. Валодзіна, Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 167 с.

*8. Веснавыя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 596 с. – (Беларуская народная творчасць).

*9. Восточно-славянский* фольклор: словарь научной и народной терминологии / редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

*10. Вяселле:* песні: у 6 кн. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. Л. А. Малаш. – Кн. 1–6. – Мінск, 1980–1988. – (Беларуская народная творчасць).

*11. Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі / Н. С. Гілевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1975. – 287 с.

*12. Жартоўныя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. І. К. Цішчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 728 с. – (Беларуская народная творчасць).

*13. Жарты,* анекдоты, гумарэскі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. А. С. Фядосік; рэд. В. К. Бандарчык. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 502 с. – (Беларуская народная творчасць).

*14. Жніўныя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 814 с. – (Беларуская народная творчасць).

*15. Жыцця* адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., [прадм., пер.] У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

*16. Загадкі* / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы; склад. М. Я. Грынблат; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 362 с. – (Беларуская народная творчасць).

*17. Замовы* / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 595 с. – (Беларуская народная творчасць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18. Зімовыя* песні: калядкі і шчадроўкі / уступ. арт. А. Гурскага; пад рэд. М. Я. Грынблата. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 736 с.

*19. Зямля* стаіць пасярод свету: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., [прадм., пер.] У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Кн. 1.– 591 с.

*20. Зямная* дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., [прадм., пер.] У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Кн. 3. – 654 с.

*21. Казкі* пра жывёл і чарадзейныя казкі / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад. К. П. Кабашнікаў; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 528 с. – (Беларуская народная творчасць).

*22. Казкі* ў сучасных запісах / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад. К. П. Кабашнікаў; рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 437 с. – (Беларуская народная творчасць).

*23. Крук, І. І.* Следам за сонцам: беларускі народны каляндар / І. І. Крук. – Мінск: Ураджай, 1998. – 216 с.

*24. Купальскія* і пятроўскія песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 662 с. – (Беларуская народная творчасць).

*25. Кухаронак, Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX–XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

*26. Легенды* і паданні / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 550 с. – (Беларуская народная творчасць).

*27. Лепешаў, І.Я.* Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 509 с.

*28. Лірычныя* песні: зборнік / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 263 с. – (Беларускі фальклор у сучасных запісах).

*29. Ліс, А. С.* Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэт. аспект / А. С. Ліс; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 186 с.

*30. Ліцвінка, В. Д.* Слова міма не ляціць: бел. нар. прыказкі і прымаўкі / В. Д. Ліцвінка, Л. А. Царанкоў. – Мінск: Універсітэцкае, 1985. – 194 с.

*31. Назвы* населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў: у 6 кн. / склад., запіс, апрац. А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларусь, 1998–2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*32. Песні* народных свят і абрадаў / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1974. – 294 с. – (Беларускі фальклор у сучасных запісах).

*33. Песні* пра каханне / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы; склад. І. К. Цішчанка; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 378 с. – (Беларуская народная творчасць).

*34. Прыпеўкі* / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 451 с. – (Беларуская народная творчасць).

*35. Радзіны:* абрад. песні / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад.: Г. А. Пятроўская [і інш.]; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 635 с. – (Беларуская народная творчасць).

*36. Салавей, Л. М.* Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 183 с.

*37. Сацыяльна-бытавыя* казкі: зборнік / Акадэмія навук Беларускай ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад. А. С. Фядосік; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 515 с. – (Беларуская народная творчасць).

*38. Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 216 с.

*39. Сямейна-бытавыя* песні / склад. І. К. Цішчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 421 с. – (Беларуская народная творчасць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных абрадавых дзеяннях, паняццях, тэмах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (фальклорных жанраў, сюжэтаў, матываў, міфапаэтычнай асновы абрадаў і інш.). Веданне навуковай і даведачнай літаратуры па фальклоры |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне аб'ектаў вывучэння з тлумачэннем іх светапогляднай міфапаэтычнай асновы), веданне жанравай разнастайнасці беларускага фальклору.<br>Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры па дысцыпліне.<br>Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё сутнасці з'яў і фармуліроўка азначэнняў. Уменне аналізаваць з'явы фальклору з улікам набытых ведаў.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Сістэмнае веданне студэнтам генезісу каляндарных і сямейных абрадаў, жанравай разнастайнасці пазаабрадавага фальклору.<br>Добрае веданне фальклорных тэкстаў, асноўнай і дадатковай літаратуры па фальклоры. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Грунтоўныя і трывалыя веды. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў беларускага фальклору, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць з'явы беларускай народнай традыцыйнай культуры з улікам ведаў па этнаграфіі, гісторыі, мовазнаўстве. Веданне значнай колькасці фальклорных тэкстаў.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне вывучаных з'яў беларускага фальклору. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў беларускага фальклору, актуальных праблем навукі. Уменне прымяняць свае веды ў межах прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы беларускай народнай традыцыйнай культуры ў шырокім гісторыка-культурным кантэксце. Веданне значнай колькасці фальклорных тэкстаў, навуковай літаратуры па пытаннях фалькларыстыкі і звязаных з ёй гуманітарных дысцыплін |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі:**

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
– выступленні студэнтаў на семінарах па распрацаваных імі тэмах;
– вуснае апытанне студэнтаў падчас заняткаў;
– пісьмовы экзамен, вусны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ**
**Раздзел II. БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці**
**1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60×84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. .
Тыраж экз. Заказ .

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.